# Сучасная «песня пра зубра»

Паляваць ці не паляваць на зубра? Не сціхаюць спрэчкі вакол мэтазгоднасці дазволу прадаваць за валюту іншаземцам

ліцэнзіі на адстрэл гэтага аднаго з самых вядомых "чырванакніжнікаў" планеты.

### *І на волі няма яму спакою*

Памятаю, з якім абурэннем многія ўспрынялі летась навіну ў СМІ аб спробе продажу за вялікія грошы паляўнічай ліцэнзіі на "элітнага зубра". Прызнаюся, сярод абураных быў і я. Ну як так можна? Гонар краіны, яе нацыянальны сімвал, рэдкі від фауны — і дазволіць яго страляць дзеля забавы заможным іншаземцам, як звычайных дзіка ці зайца? Бо менавіта на іх, багатых паляўнічых "з-за бугра", рабілася стаўка. Кошт ліцэнзіі быў рэкордным для Беларусі — 40 тысяч еўра. Па цяперашнім курсе салідная сума ў рублях. Аднак пасля ўдзелу ў навукова-практычным семінары па праблематыцы захавання рэдкіх відаў дзікіх жывёл і раслін, які праходзіў з удзелам намесніка міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Анатоля Ліса, іншых супрацоўнікаў гэтага ведамства, змяніў сваё меркаванне.

У прыватнасці, мне здалося слушным выступленне загадчыка лабараторыі тэрыялогіі навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах, прафесара П. Козлы. Ён амаль усё жыццё прысвяціў аднаўленню зубра ў Беларусі. Сёння ж, як гэта ні дзіўна, выступае за дазвол камерцыйнага палявання на яго. На яго думку, можна без страт для беларускай папуляцыі дазваляць штогадовы адстрэл пэўнай колькасці (яе павінна вызначаць камісія) зуброў. Праўда, рабіць гэта трэба па ясных і адназначных правілах пад жорсткім наглядам егераў. І не ў самой, скажам, Белавежскай пушчы, а на тэрыторыі суседніх лясных масіваў, куды часта заходзяць зубры. Можна таксама прадаваць частку зуброў за межы краіны. Усё часцей аб сабе нагадвае рост матэрыяльных і фінансавых выдаткаў на фарміраванне новых і ўтрыманне ўжо створаных статкаў зуброў.

Пытанне аб тым, страляць ці не страляць зуброў, даволі складанае і супярэчлівае па розных прычынах. Пазіцыя "зялёных", эколагаў, заўзятых прыхільнікаў неўмяшання чалавека ў прыроду непахісная: як можна такое нават абмяркоўваць? Зубр — адзін з самых вядомых у свеце "чырванакніжнікаў", ён занесены ў многія нацыянальныя "Чырвоныя кнігі" — беларускую, польскую, літоўскую, украінскую і г.д. Зубр (ці як яшчэ завуць яго, еўрапейскі бізон) мае статус аднаўляльнага віду, на які не прадугледжваецца дазвол на яго паляванне. А з іншага боку, як гэта ні парадаксальна гучыць, ужо само жыццё ўсё мацней падштурхоўвае да вырашэння наспелай праблемы колькаснага рэгулявання зуброў у нашай краіне. Толькі ў Белавежскай пушчы іх статак (ці, па-навуковаму кажучы, мікрапапуляцыя) налічвае прыкладна 415 жывёл. Яна самая вялікая ў Беларусі. У сваю чаргу, згодна з рэкамендацыяй навукоўцаў, аптымальная для пушчы колькасць гэтых жывёл павінна быць на ўзроўні 250, максімум — 350 асобін. Бо ім ужо даўно элементарна не хапае прыродных рэсурсаў для паўнацэннага сілкавання. І гэта самая простая праблема, астатнія ўвогуле пагражаюць нармальнаму існаванню гэтых велічных і шматпакутных жывёл.

### *Цяжкі лёс еўрапейскага бізона*

Для беларусаў зубр — асаблівая жывёла. Спрадвеку нашы продкі захапляліся зубрамі, складалі пра яго паданні, легенды, казкі. У гонар гэтага магутнага волата быў напісаны не адзін літаратурны твор. Дастаткова ўзгадаць знакамітую паэму Мікалая Гусоўскага "Песня пра зубра", якая была выдадзена ў Кракаве яшчэ ў 1523 годзе. Першая сусветная вайна, ліхалецці рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, пасляваеннага перыяду сталі ракавымі для белавежскіх зуброў. Калі ў 1914 годзе іх у пушчы налічвалася амаль 700, то праз год гэтая лічба скарацілася да 300. Далей — больш. Яшчэ праз год зуброў стала менш на сотню, а потым — і яшчэ менш, а ў лютым 1919 года была забіта апошняя зубрыха. Па сумнай іроніі лёсу кропку тады ў шматвяковай гісторыі беларускіх зуброў паставіў мясцовы жыхар, ляснік з вёскі Сточак.

Як від зубр быў канчаткова знішчаны не толькі ў Беларусі. Сёння цяжка паверыць, што да 1927 года ў жывой прыродзе зубра нельга ўжо было знайсці. І дзякуй Богу, што ў няволі — еўрапейскіх заапарках і заасадах, паводле інфармацыі спецыяльна праведзенага міжнароднага перапісу, былі выяўлены 52 зубры. Цікавая дэталь: усе яны паходзілі ад 5 быкоў і 7 кароў, так званых жывёл-заснавальнікаў. Вось з гэтай малалікай групы праз 80 гадоў агульны (у свеце) зубрыны статак дасягнуў ужо больш чым 4000 жывёл. З іх больш за палову сёння жывуць у прыродзе. Праўда, пад тактоўным, але пастаянным і пільным наглядам людзей, дзякуючы намаганням якіх мы маем цудоўную магчымасць назіраць зубра. Вялікая ў гэтым заслуга спецыялістаў і навукоўцаў Беларусі, якія шмат зрабілі для аднаўлення папуляцыі зуброў у Белавежскай пушчы, іх рассяленню ў іншых лясах краіны. Сёння па колькасці зуброў Беларусь выйшла на другое месца ў свеце пасля Польшчы. Цяпер практыкі і вучоныя ломяць галаву над тым, што зараз рабіць з такім вялікім статкам (а гэта прыкладна 1050-1100 жывёл), як яго захаваць на доўгія часы? Бо з колькасцю зуброў адпаведна выраслі і праблемы па іх доглядзе.

### *Уся справа ў генафондзе*

Зноў узнікла рэальная пагроза для гэтага рэдкага віду. Спецыялісты гавораць, што беларускай папуляцыі еўрапейскага зубра ўласцівы нізкі паказчык генетычнай разнастайнасці і высокі ўзровень інбрыдзінгу — скрыжаванне блізкароднасных формаў у межах адной папуляцыі жывёл. Тое, што аднаўленне беларускіх зуброў пачыналася ўсяго з 12 жывёл, з часам істотна адбілася на яе генафондзе. Ён зараз аслаблены. І даволі моцна. Адсюль і частыя інфекцыйныя хваробы гэтых вельмі магутных на выгляд жывёл.

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў пачалі ўсё больш выразна праяўляцца зубрыныя праблемы: замарудзіўся рост колькасці жывёл, знізілася ўзнаўленне статка, значна пачасціліся выпадкі захворванняў гэтых волатаў. Яны сёння хварэюць на страўнік, пакутуюць нават ад катаракты вачэй і страты слыху, з-за чаго сляпыя і глухія жывёлы атрымоўваюць цяжкія, часам смяротныя траўмы. Амаль трэць маладняку, які меў няшчасце быць народжаным позняй восенню ці ўзімку, адстае ў росце, хварэе на рахіт, запаленне лёгкіх і звычайна гіне. Паводле інфармацыі экспертаў, у выніку вымушанай барацьбы за існаванне хворых (а значыць, непрыстасаваных да жыцця ў прыродзе зуброў, і асабліва зімой), іх смяротнасць вагаецца ад 55 да 130 жывёл штогод.

Як вырataваць зубра? Скажу шчыра: дакладнага адказу на гэтае пытанне я не ведаю. Таму перакажу тое, што пачуў ад спецыялістаў на семінары. Яны, у прыватнасці, выступалі за стварэнне новых папуляцый, што спрыяе захаванню віду. Але, па экспертных ацэнках, толькі для набыцця элементарнай групоўкі жывёл (8-12 жывёл) у якасці ядра для фарміравання новай мікрапапуляцыі зуброў трэба як мінімум 30 тысяч еўра, а штогадовыя выдаткі на стварэнне кармавых палёў, прафілактычнае кармленне, ветэрынарны нагляд пацягнуць ад 4 да 6 тысяч еўра ў залежнасці ад колькасці статка. Але грошы — не самае асноўнае. Навукоўцы кажуць, што тут поспех у многім залежыць ад правільнага выбару тэрыторыі рассялення. Бадай, галоўная ўмова — наяўнасць кармавой базы (у прыватнасці, значнай колькасці лясных палян з разнатраўем). Гэта абумоўлівае магчымасць самастойнага існавання жывёл і яго натуральнае ўваходжанне ці прыстасаванне да мясцовасці, прыроднага асяроддзя, тых дрэў, раслін, жывёл, грыбоў і мікраарганізмаў, што яе насяляюць ужо не адно стагоддзе.

### *Замест пасляслоўя*

Той "элітны зубр", які летась рэкламаваўся на інтэрнэт-аўкцыёне для палявання за вельмі круглую па нашых мерках суму, на самай справе быў зусім не элітным быком у росквіце гадоў, а старым і хворым самцом з цяжкай траўмай нагі, відаць, атрыманай у бітве з канкурэнтам за прыгажуню-зубрыху. Што і было ў яго элітным, дык гэта шыкоўныя рогі — жаданы трафей для багатага паляўнічага. Як і прадказвалі спецыялісты, нядоўга той зубр таптаў лясныя сцежкі. Па словах Аляксея Буневіча, вядомага зубразнаўцы, старшага навуковага супрацоўніка нацыянальнага парку "Белавежская пушча", небарака ўжо ціха памёр сваёй смерцю ў лясным гушчары. Аляксей Мікалаевіч выказаў шкадаванне з нагоды няўдачы з продажам права на адстрэл таго зубра з рэзервовага статка. За 40 000 еўра можна было б шмат чаго карыснага зрабіць для астатніх здаровых зуброў

— напрыклад, правесці біятэхнічныя даследаванні, зменшыць выдаткі на ўтрыманне статка ўзімку. Гэта прагматычны падыход чалавека, які шмат гадоў амаль штодзень працуе ў лесе з зубрамі. Такая вось сучасная і трохі сумная "Песня пра зубра-2".

***Леанід Лахманенка.***

**Источник:** Звязда.-2012.-№ 13 (21 студз.).-С.3.